Падтрымай "Вясну" на PATREON

Яшчэ аднаго жыхара Жлобіна асудзілі за падзеі 9 жніўня

21.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Пратэсты ў Жлобіне пасля выбараў 2020. Скрыншот з відэа

У судзе Жлобінскага раёна 19-20 ліпеня разглядзелі крымінальную справу 21-гадовага Мікіты Кругліка. Хлопца вінавацілі ў актыўным удзеле ў групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак, у ноч з 9 на 10 жніўня ў Жлобіне (ч. 1 арт. 342 КК).

Справу вёў суддзя **Ігар Змушко**, бок дзяржабвінавачвання прадстаўляў **Сямён Фядорчанка**.

Паводле абвінавачвання, Мікіта Круглік быў дасведчаны пра правядзенне несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў у Жлобіне пасля выбараў прэзідэнта, каля 22 гадзін 9 жніўня прыйшоў у цэнтральную частку горада, з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў і пратэста супраць хода і вынікаў выбараў, а таксама вядзення дэструктыўнай дзейнасці, накінавай на абвастрэння напружанасці ў грамадстве, прыняў актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, груба парушаючых грамадскі парадак і спалучаных з яўным непадпарадкаваннем патрабаванням прадстаўнікоў улады. Пры гэтым, абвінавачаны сумесна з іншымі актыўнымі ўдзельнікамі мітынгу наўмысна перашкаджаў руху транспарта і працы прадпрыемстваў: пратэстоўцы знаходзіліся на

праезнай частцы дарогі, стаялі у счэпцы, гучна пляскалі ў далоні, выкрыквалі лозунгі, свісцелі, не выконвалі патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі. У выніку такіх дзеянняў некалькі аўтобусаў былі вымушаныя змяніць маршрут свайго руху, таксама вымушана спыніў працу магазін “Мір прадуктаў”.

Мікіта Круглік прызнаў сваю віну і патлумачыў, што “быў там, апынуўся не ў той час і не ў тым месцы”.

Ён патлумачыў, што ў той дзень схадзіў прагаласаваць, не працаваў інтэрнэт, хлопец не ведаў пра заклікі для збору людзей, а проста вырашыў сустрэцца з сябрам і пагуляць. Ужо каля кінатэатра “Радзіма” ён пабачыў шмат людзей і супрацоўнікаў міліцыі, якія заклікалі людзей разыйсціся. Хлопец сустрэў некалькіх сваіх знаёмых, падышоў з імі паразмаўляць. Дарога была ўжо перакрытая супрацоўнікамі міліцыі, магазін, куды Мікіта накіраваўся з сябрамі, каб набыць вады, ужо быў закрыты.

З натоўпу гучалі выкрыкі “Сыходзь” і “Кідай шчыты”, людзі пляскалі ў далоні. Сам абвінавачаны таксама некалькі разоў пляскаў у далоні пад уздзеяненнем іншых людзей. Сябр, з якім Мікіта збіраўся сустрэўся, таксама прысутнічаў там.

На месцы падзей абвінавачаны прабыў толькі 21 хвіліну, пасля чаго сышоў, пагуляў з сябрам па горадзе і пайшоў дадому.


Чацвёра сведкаў – супрацоўнікі аўтобуснага парку – у судзе патлумачылі, што дарогі былі перакрытыя фурамі па загаду ДАІ, рух аўтобусаў змяніўся, але гэта не перашкаджала выконваць працу, пасажыры не скардзіліся, урону аўтапарку нанесена не было і ён не мае матэрыяльных прэтэнзіяў.

Падчас спрэчак бакоў Сямён Фядорчанка прасіў суд прызнаць Мікіту Кругліка вінаватым у здзяйсненні злачынства па арт. 342 і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады і шэсць месяцаў.

Суддзя пагадзіўся з прапановай пракурора і асудзіў абвінавачанага на два з паловай гады “хатняй хіміі”.

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

Светлагорскіх "рэйкавых партызан" этапавалі ў калоніі

71-гадовага пенсіянера Васіля Дземідовіча асудзілі яшчэ да 2,5 гадоў калоніі

1000 дзён дзяржаўнага тэрору ў Беларусі

659 маладзёнаў знаходзяцца за кратамі (дакумент)

Дайджэст вызваленых: 11 палітвязняў у красавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

У красавіку судамі ў крымінальным парадку рэпрэсавана не менш за 43 чалавекі

За "здраду дзяржаве" пачалі судзіць былога начальніка службы паветранай выведкі

Заява праваабаронцаў аб прызнанні пяці палітычных зняволеных

У Гомелі пачалі судзіць па пратэсных артыкулах бармена "Кватэрніка" Глеба Вятошкіна

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

